она – бушующий импульс человечности, братский клич глубины веков. Стена учит нас по-новому (но и в согласии с древностью) взглянуть на небо, на озёра, поля; открыть свою память для осознания космоса вокруг себя и космоса в себе. Своей милосердной значительностью и конструктивностью она спасает человечество от явлений жестоко мелочных и неконструктивных.

**Литература**

1. Куликов, В., Бергольцев, Л., Корнюшин, В. Китай.– М.: Планета, 1989.
2. Куликов, В.С. Китайцы о себе.– М.: Политиздат, 1989.

УДК 37.014.24

В.В. Шахаб, дацэнт, канд. пед. навук,
дырэктар Цэнтра Якуба Коласа,
(Цяньцзінскі ўніверсітэт замежных моў,
г. Цяньцзінь, КНР)

## ЦЭНТР ЯКУБА КОЛАСА Ў КІТАІ: МЭТЫ, ЗАДАЧЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

Забеспячэнне прэстыжу і запатрабаванасці за мяжой беларускай вышэйшай адукацыі з'яўляецца надзвычай актуальнай задачай для Беларусі. Палітыка нашай дзяржавы накіравана на ўмацаванне дзяржаўнасці, павышэнне эканамічнай прыцягальнасці нашай краіны для замежных грамадзян, папулярызацыю Беларусі як еўрапейскай краіны з моцным этнакультурным і адукацыйным асяроддзем.

Традыцыйна беларуская мова з'яўляецца арганічным элементам айчыннай сістэмы адукацыі і неад'емным складнікам жыцця беларускага грамадства. Але не менш важным бачыцца вывучэнне беларускай мовы замежнымі грамадзянамі, калі ў плыні масавай глабалізацыі кожнаму народу неабходна не толькі захоўваць нацыянальнае аблічча, але і праз сваю мову фарміраваць станоўчы імідж краіны за мяжой. У гэтым кантэксце вывучэнне беларускай мовы ў Кітаі спрыяе павышэнню эфектыўнасці міжнародных зносін паміж нашымі краінамі, а беларуская мова як замежная разглядаецца ў якасці аднаго з вядучых фактараў забеспячэння міжнародных стасункаў паміж нашымі дзяржавамі.

Папулярызацыя і пашырэнне сферы ўжывання беларускай мовы як замежнай у Кітаі рэалізуецца ў цесным узаемадзеянні з Пасольствам Рэспублікі Беларусь, установамі вышэйшай адукацыі, навукова-даследчымі цэнтрамі, культурна-асветніцкімі ўстановамі Рэспублікі Беларусь. У прыватнасці, універсітэцкая супольнасць абедзвюх краін садзейнічае плённым навуковым і адукацыйным стасункам у галіне вывучэння моў. Так, у Цяньцзінскім універсітэце замежных моў, дзе ўпершыню ў Кітаі ў 2017 годзе адбыўся набор студэнтаў на спецыяльнасць бакалаўрыяту «Беларуская мова» і была створана кафедра беларускай мовы, пачаў функцыянаваць Цэнтр вывучэння Беларусі. Актыўныя беларуска-кітайскія стасункі выявілі пытанні, вырашэнне якіх патрабавала пэўнай лакалізацыі сумесных намаганняў і абмеркавання навукова-выкладчыцкай супольнасці абедзвюх краін.

Таму ў чэрвені 2019 года Цяньцзінскі ўніверсітэт замежных моў і Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт заснавалі першы ў Кітаі і за межамі Беларусі Цэнтр Якуба Коласа. Улічваючы тое, што помнік Якубу Коласу ў 2018 годзе быў урачыста ўстаноўлены на тэрыторыі кампуса кітайскага ўніверсітэта, а сам паэт абраны своеасаблівым апекуном беларускай прысутнасці ў Цяньцзіні, назва Цэнтра была абрана невыпадкова. У сучаснай культурнай прасторы творчасць Якуба Коласа мае вялікую культуралагічную, гістарычную, сацыяльную, філасофскую, псіхалагічную, педагагічную і метадычную каштоўнасць. Асоба пісьменніка, класіка сусветнай і беларускай літаратуры, перакладчыка, вучонага, педагога, грамадскага дзеяча, народнага паэта Беларусі, акадэміка Акадэміі навук Беларусі, заслужанага дзеяча навукі Беларусі сімвалізуе веліч чалавека, які сумленна выконвае сваю грамадзянскую місію – служыць сваёй Радзіме і народу, годна прадстаўляючы яго ў свеце.

Мэты Цэнтра Якуба Коласа:

• пашырэнне беларуска-кітайскіх сувязей у сферы навукі, адукацыі і культуры;

• папулярызацыя беларускай культуры, мовы і літаратуры ў Кітаі;

• прафесійная падтрымка педагогаў-беларусістаў у Кітаі.

Задачы Цэнтра Якуба Коласа:

• азнаямленне кітайскіх студэнтаў з лінгвакраязнаўчай адметнасцю Беларусі;

• інтэнсіфікацыя кітайска-беларускага культурнага абмену;
• павышэнне цікавасці да вывучэння беларускай мовы ва ўніверсітэтах Кітая;
• пашырэнне сферы выкарыстання беларускай мовы ў кітайска-беларускім супрацоўніцтве;
• забеспячэнне доступу да якасных праграм навучання і развіцця на беларускай мове для грамадзян Беларусі і Кітая;
• распрацоўка актуальнай і эфектыўнай лінгваметадычнай сістэмы навучання беларускай мове як замежнай для кітайскіх студэнтаў і падрыхтоўка яе рэсурснага забеспячэння на тэрыторыі Кітая і Беларусі;
• стварэнне базы даных аб метадычным забеспячэнні навучання беларускай мове як замежнай;
• арганізацыя адукацыйных, асветніцкіх, выставачных, прэзентацыйных і іншых мерапрыемстваў;
• стварэнне агульнай базы літаратурных твораў, перакладзеных з беларускай мовы на кітайскую і наадварот, літаратуразнаўчых матэрыялаў па адпаведнай тэматыцы;
• пераклад з кітайскай мовы на беларускую і наадварот мастацкіх твораў, навуковых, вучэбных і вучэбна-метадычных выданняў, іх рэдактарская падрыхтоўка;
• арганізацыя коласазнаўчых даследаванняў;
• падрыхтоўка, выданне і адаптацыя навуковай, вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры, у тым ліку для дыстанцыйнага і самастойнага навучання.

Дзейнасць Цэнтра Якуба Коласа грунтуецца на прынцыпах прыярытэту агульначалавечых і агульнанацыянальных каштоўнасцяў; публічнасці і адкрытасці планаў і вынікаў сумеснай працы; карэктнасці ў выкарыстанні агульнага інфармацыйнага поля; пераемнасці і перспектыўнасці на аснове безумоўнага і абавязковага выканання заканадаўства абедзвюх краін.

Попыт на кваліфікаваныя кадры ў сферы перакладу, міжмоўных камунікацый, выкладання замежных моў абумоўлівае відавочную неабходнасць распрацоўкі актуальнай і эфектыўнай лінгваметадычнай сістэмы навучання беларускай мове як замежнай, накіраванай на авалоданне перцэптыўнымі (чытанне, аўдзіраванне) і прадуктыўнымі (гаварэнне, пісьмо) відамі маўленчай дзейнасці, практычна рэалізаваць прапанаваную сістэму ва ўстановах вышэйшай адукацыі Кітайскай Народнай Рэспубліцы і Рэспубліцы Беларусь. Таму павышэнне якасці аду-

кацыйных планаў і праграм па беларускай мове і пашырэнне іх спектру з'яўляюцца адным з прыярытэтных напрамкаў працы Цэнтра Якуба Коласа.

Стварэнне сайта Цэнтра на платформе Цяньцзінскага ўніверсітэта дазволіць аператыўна асвятляць усе напрамкі дзейнасці, размяшчаць відэалекцыі, відэакурсы і базы даных, адкрые доступ да бібліятэк беларускіх універсітэтаў, паспрыяе арганізацыі кансультацыйна-суправаджальнай дапамогі па актуальных пытаннях, у тым ліку па перакладчыцкай працы (публіцыстыка, мастацкая літаратура, субтытры да кінафільмаў).

Кітайскі бок стварыў для працы Цэнтра найлепшыя ўмовы, і ў калектыва кафедры беларускай мовы Цяньцзінскага ўнаверсітэта ўжо ёсць вынікі: у наяўнасці найноўшыя тэхнічныя сродкі і мультымедыі, актыўна назапашваецца бібліятэка беларускіх кніг, на этапе завяршэння падручнік па краіназнаўстве Беларусі, у друку хрэстаматыя па краіназнаўстве і ўводна-фанетычны курс па беларускай мове. Праведзена некалькі лекцый з запрошанымі лектарамі, канферэнцыі, форум, фестываль, фотавыставы і многае іншае, працуюць два запрошаныя прафесары з Беларусі.

Адзінае, што перашкаджае,– гэта недахоп іміджавай інфармацыі пра Беларусь. Такіх матэрыялаў на самай справе вельмі мала, яны аднастайныя. Ёсць адзінкавыя аўтарытэтныя сайты, на якія можна спасылацца, дастаткова мала якасных відэаматэрыялаў. Гэта істотны прабел у пазіцыянаванні нашай краіны на міжнародным узроўні. Пры той маштабнай зацікаўленасці замежнікаў, у тым ліку кітайцаў, у самай разнастайнай інфармацыі пра Беларусь яе катастрафічна нестае. Цэнтр Якуба Коласа якраз спрыяе ўмацаванню беларуска-кітайскіх стасункаў на грунтоўным адукацыйна-культурным падмурку.